УДК 633.13 : 632.51 : 631.55 (476)

В. П. МОЎЧАН

УПЛЫЎ ЗАСМЕЧАНАСЦІ ПАСЕВАЎ НА ЎРАДЖАЙНАСЦЬ, НАСЕННУЮ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ НАСЕННЯ АЎСА СОРТУ БУГ

Мэтай даследаванняў з'явілася вывучэнне ўплыву засмечанасці пасеваў на ўраджайнасць, насенную прадукцыйнасць і якасць насення аўса сорту Буг. Доследы праводзіліся ў 1985—1987 гг. на дзярнова-падзолістай супясчанай глебе эксперыментальнай базы «Зазер'е» Пуха-

віцкага раёна Мінскай вобласці. Аграхімічныя паказчыкі глебы: pH_{KCl} 5,9—6,0, колькасць P_2O_5 — 14,3, K_2O — 11,5 мг/100 г глебы, гумус — 2,1%.

Папярэднік — ячмень на зерне. Агратэхніка вырошчвання агульнапрынятая для дадзенай зоны. Восенню, пасля ўборкі папярэдніка, праводзіліся лушчэнне і ўзворванне на глыбіню 20—22 см. Вясной пад перадпасяўную культывацыю ўносілі мінеральныя ўгнаенні з разліку $N_{90}P_{80}K_{120}$. Сяўбу праводзілі ў аптымальныя тэрміны з нормай высявання 4, 5, 6 млн шт. усходжага насення на 1 га. Гербіцыды (сумесь 2,4-ДА, 0,4 кг/га д. р.+2 М-4 ХП, 1 кг/га д. р.) уносілі ў фазе кушчэння аўса з нормай расходу рабочай вадкасці 300 л/га. Пустазелле ўлічвалі на 25-ы дзень пасля ўнясення гербіцыдаў. Схема доследу прыведзена ў табл. 2.

Паўторнасць доследу чатырохразовая. Уліковая плошча дзялянкі 25 м². Ураджайнасць пералічвалі на 100%-ную чысціню і 14%-ную вільготнасць.

Метэаралагічныя ўмовы года правядзення даследаванняў былі рознымі. Найбольш спрыяльнымі па вільгацезабяспечанасці і тэмпературы паветра, а таксама па эфектыўнасці гербіцыдаў былі 1985 і 1987 гг. У 1986 г. недахоп вільгаці ў час сяўбы і ў маі—чэрвені адбіўся на ўраджайнасці зерня аўса.

У гады даследаванняў пасевы былі засмечаны рознымі відамі пустазелля, у асноўным шматгадовымі: мар'ю белай, рэдзькай дзікай, макрыцай, свінакропам, драснамі (бярозкавым, шурпатым) і інш. Са шматгадовага пустазелля сустракаліся асот палявы, бярозка, пырнік паўзучы. Да хімічнай апрацоўкі на ўсіх вывучаемых варыянтах налічвалася 291—541 шт/га пустазелля.

Даследаваннямі вызначана, што прыкатванне глебы да сяўбы, пасля яе і перад і пасля сяўбы (два разы) у параўнанні з варыянтам без прыкатвання павышала ступень засмечанасці пасеваў аўса на 29,9—45,8%. Павелічэнне засмечанасці пасеваў ад прыкатвання можна тлумачыць тым, што гэты спосаб дадатна ўплывае на прарастанне насення не толькі аўса, але і пустазелля. Пад уплывам гербіцыдаў агульная засмечанасць пасеваў знізілася на 79,5—88,9%. Аслабленае пустазелле, якое засталося пасля хімічнай апрацоўкі, развівалася ў ніжнім ярусе і прыгнечвалася культурнымі раслінамі. Таму яго паветрана-сухая маса перад уборкай складала 20—34,9 г/м².

На варыянтах жа без хімічнай апрацоўкі назіралася адваротная залежнасць — колькасць пустазелля павялічылася на 6,6—11,4%. Пры гэтым неабходна адзначыць, што максімальнае павелічэнне (11,4%)

Табліца 1. **Уплыў хімічнай праполкі на засмечанасць пасеваў аўса сорту Буг (сярэдняе за 1985—1987 гг.)**

Варыянт	Норма высеву, млн шт/га	Хімічная апрацоўка			Без хімічнай апрацоўкі				
		зыходная засмечанасць, шт/м²	% страт	паветрана-сухая маса пустазелля перад уборкай, г	зыходная засмечанасць, шт/м²	праз 24 дні, шт/м²	± да зыходнай колькасці, %	перад уборкай, шт/м²	паветрана-сухая маса пустазелля перад уборкай, г
1	4	291	—79,5	34,9	315	391	+11,4	355	368,8
2	5	371	—87,6	24,5	380	417	+9,7	386	307,5
3	5	482	—85,1	31,2	516	550	+6,6	395	282,5
4	5	541	—83,4	20,0	460	499	+8,5	352	240,0
5	5	537	—86,8	31,2	437	476	+8,9	386	190
6	6	425	—88,9	27,6	393	431	+9,7	280	187,5
V, %		22,5	—	19	16,7	—	—	12,8	26,7

Заўвага. Вар. 3—5 — сярэдняе за 1986—1987 гг.